# ДНІ КУЛЬТУРЫ Ў СФЕРЫ ДВУХБАКОВЫХ СУВЯЗЕЙ БЕЛАРУСІ Ў НАЙНОЎШЫ ЧАС

Д. А. Крывашэй (Мінск)

Адной з найбольш маштабных форм міжнароднага культурнага супрацоўніцтва з'яўляюцца Дні культуры. Адзначым, што ў залежнасці ад асноўнага арганізатара такіх акцый змяняецца афіцыйная назва мерапрыемства. Калі арганізатарам выступае орган выканаўчай улады, які адказвае за сферу культуры краіны, то ў назву Дзён выносіцца афіцыйная назва дзяржавы. Калі арганізатарам правядзення Дзён, тыдняў, гадоў культуры выступала пасольства ці грамадская арганізацыя, то замест назвы краіны (за рэдкім выключэннем) гучыць прыметнік.

Першыя афіцыйныя Дні культуры Рэспублікі Беларусь адбыліся ў Нідэрландах (правінцыя Оверысель) з 15 па 22 снежня 1991 г. Прайшоўшыя у пяці гарадах Нідэрландаў 12 прадстаўленняў беларускіх калектываў наведалі больш 10-ці тыс. чалавек. Да адкрыцця Дзён культуры быў прымеркаваны візіт афіцыйнай дэлегацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [1, арк. 7].

У Табліцы на падставе вывучэння архіўных дакументаў і звестак перыядычнага друку прадстаўлена інфармацыя аб правядзенні менавіта афіцыйных Дзён культуры. Як можна заўважыць, да 1997 г. такія акцыі былі адзінкавымі. За 1991–1997 гг. наша краіна змагла арганізаваць Дні культуры толькі ў шасці краінах. Пры гэтым у 1992, 1994 і 1996 г. такія акцыі не праводзіліся. У той жа час ў Беларусі прайшлі Дні культуры таксама шасці краін. З чатырмя краінамі ўдалося правесці абменныя дні (Украіна, Расія, Польшча, Малдова).

У 1998 г. заўважна істотная актыўнасць Беларусі ў напрамку рэгіёнаў Расіі, што тлумачыцца палітычным фактарам. З 1999 па 2014 гг. у Беларусі ні адна краіна Еўропы (не лічачы былыя рэспублікі СССР) не правяла сваіх Дзён культуры. Пасля працяглага перапынку першай еўрапейскай краінай (не лічачы былыя рэспублікі СССР), у якой Рэспубліка Беларусь правяла свае Дні культуры пасля 1997 г., была Балгарыя (2002 г.) А вось Дні культуры Рэспублікі Беларусь у Польшчы былі праведзены ў 2013 г. пасля перапынку ў 15 гадоў.

Сярод краін-суседзяў плённымі былі культурныя кантакты з Украінай. Толькі ў 1990-х гадах Дні культуры Украіны ў Беларусі прайшлі чатыры разы (1994, 1995, 1996, 1997). У той час як Дні культуры Беларусі ва Ўкраіне толькі адзін раз (1993). Пасля 2000 г. статыстыка была на карысць Беларусі: Дні культуры Рэспублікі Беларусь ва Ўкраіне адбыліся тройчы (2002, 2003, 2010), а Дні культуры Украіны ў нашай краіне прайшлі двойчы (200, 2011).



Репозиторий ВГУ

Аналіз паказаў, што толькі з адной краінай (апроч Расіі) абменныя Дні культуры праводзіліся рэгулярна пачынаючы з 2000 года. Гэта Кітай.

Здаралася, што плануемыя Дні культуры так і не адбываліся. Так было з Днямі культуры Сербіі ў Беларусі. Дні культуры Беларусі ў Сербіі прайшлі ў 2005 г. Правядзенне сербскім бокам такіх жа мерапрыемстваў планавалася на 2007 г. Але яны не адбыліся. У 2012 г. была падпісана праграма супрацоўніцтва паміж міністэствамі культуры абедзьвюх краін і прайшла інфармацыя аб тым, што дні культуры Сербіі будуць праведзены ў 2013 г. Але яны зноў не адбыліся. Былі праведзены толькі Дні сербскага кіно ў 2014 г. У лістападзе 2014 г. прайшлі Дні беларускага кіно ў Сербіі [2].

Табліца. Дынаміка правядзення афіцыйных Дзён культуры. 1991–2017 гг.

| *Год* | *Дні культуры ў Беларусі* | *Дні культуры Рэспублікі Беларусь за мяжою* |
|---|---|---|
| 1991 | | Нідэрланды |
| 1992 | | |
| 1993 | Расія | Украіна |
| 1994 | Украіна, Польшча | |
| 1995 | Украіна, Польшча, Расія | Расія, Германія |
| 1996 | Украіна, Малдова | |
| 1997 | Украіна, Балгарыя, Іспанія | Польшча, Малдова, Краснадарскі край (Расія) |
| 1998 | Югаславія, Венгрыя, Краснадарскі край (Расія) | РАСІЯ: Кемераўская вобласць, г. Санкт-Пецярбург, Краснадарскі край, Яраслаўская вобласць, Смаленская вобласць, Калінінградская вобласць |
| 1999 | РАСІЯ: Краснадарскі край, Мурманская вобласць | Кітай, Мурманская вобл. (Расія), Крым (Украіна) |
| 2000 | Малдова, Кітай, Крым (Украіна), Карэлія (Расія) | Краснадарскі край (Расія) |
| 2001 | Расія | Расія, Карэлія (Расія), Кітай |
| 2002 | Кітай, Карэлія (Расія) | Украіна, г. С.-Пецярбург (Расія), Балгарыя |
| 2003 | | Кітай, Украіна, Іран |
| 2004 | Кітай, Іран, Украіна | **Год культуры** ў Расіі |
| 2005 | Егіпет Калінінградская вобл. (Расія), Іран, **Год культуры** Расіі, Малдова | Арменія, Сербія, Кітай |
| 2006 | Кітай, Карэлія (Расія),Дзень культуры Дзяржавы Ізраіль | Ліван |
| 2007 | Азербайджан, Арменія | Егіпет, Таджыкістан |
| 2008 | Таджыкістан | Сірія, Егіпет, ПАР, Кыргызстан, Азербайджан, Кітай |
| 2009 | Кітай, Казахстан, **Год культуры** Расіі | |

Репозиторий ВГУ

| | | |
|---|---|---|
| 2010 | Туркменістан, Сірыя, Іран, В'етнам, Аман | **Год культуры** ў Расіі, ААЭ, Венгрыя, Казахстан, Літва, Украіна, Кітай |
| 2011 | Кітай, Украіна, Тыдзень культуры Ірана | Арменія, Літва |
| 2012 | Катар, Азербайджан, Ізраіль | Катар, Кітай, Туркменістан, Літва, г. С.-Пецярбург (Расія) |
| 2013 | г. С.-Петярбург (Расія), Арменія, Казахстан | Польшча, Эстонія, Азербайджан, Фінляндыя. Ізраіль, Літва |
| 2014 | Туркменістан, Венгрыя, Калужскай вобл. (Расія), Шры-Ланка, Індыя | Арменія, Казахстан, Літва, В'етнам |
| 2015 | Кітай, Лаос, В'етнам | Кітай, Туркменістан, Таджыкістан, Малдова |
| 2016 | Арменія, Эстонія, Таджыкістан, Туркменістан | Расія, Турцыя, Лаос |
| 2017 | Малдова, ААЭ, Турцыя, Расія: Пермскі край і Інгушэція | Індыя, Венгрыя, Кітай, В'етнам, Камбоджа, Грузія |
| 2018 | Татарстан (Расія), В'етнам, Украіна, Грузія, Расія, Казахстан | Кітай, Туркменістан, Узбекістан, Таджыкістан, Кіргізія, Пермскім краі (Расія) |

Дні ці Тыдні культуры ў асноўным праводзіліся ў якасці своеасаблівай падтымкі палітычных стасункаў. Напрыклад, у 2006 г. Беларусь і Азербайджан адкрылі свае пасольствы. І ўжо ў 2007 г. адбыліся першыя дні культуры Азербайджана ў Рэспублікцы Беларусь.

Часам такія мерапрыемствы спалучаліся з візітамі за мяжу кіраўнікоў дзяржаў. Так у красавіку 2001 г. і снежні 2005 г. Дні культуры Беларусі ў Кітаі праходзілі ў межах візіту Прэзідэнта Беларусі А. Р. Лукашэнка. У кастрычніку 2008 г. у рамках афіцыйнага візіту А.Г. Лукашэнка ў Кіргізскую Рэспубліку ў гэтай краіне ўпершыню былі арганізаваны Дні культуры Рэспублікі Беларусь. У 2015 г. Дні культуры Беларусі ў Туркменістане прайшлі пад час афіцыйнага візіта Главы дзяржавы ў гэту краіну.

Асаблівая адметнасць Дзён ці Тыдняў культуры ў тым, што яны арганізоўваюцца адпаведнай структурай выканаўчай улады, якая адказвае за сферу культуры. У іх адкрыцці звычайна бяруць удзел кіраўнікі гэтых струтур ці іх намеснікі. Аб тым, наколькі высокі ўзровень палітычных адносін з пэўнай краінай, сведчыць пасада асобы, якая адкрывае мерапрыемства. Напрыклад, у красавіку 2008 г. упершыню ў гісторыі двухбаковых адносінаў прайшлі Дні культуры Рэспублікі Беларусь ў Сірыі. На першым прадстаўленні Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Рэспублік Беларусь прысутнічалі старшыня парламента Сірыі Мыхмуд аль-Абраш і Прэм'ер-міністр Сірыі Махамед аль-Атры. У рамках дзён былі праведзены

Рэпазіторый ВГУ

перагаворы міністра культуры Беларусі У. Матвейчука з міністрам культуры Сірыяі Пыядам Наасанам Ага [3, с. 128].

Дні культуры Рэспублікі Малдавія ў Беларусі у 2017 г. адкрывалі прэм’ер-міністры абедзьвух краін [4]. А Дні культуры Эстонскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь у 2016 г. адкрывалі намеснікі кіраўнікоў адпаведных міністэрстваў [5]. Стала традыцыяй пад час такіх мерапрыемстваў падпісваць рознага віда дакументы кшталту міжведамасных дамоваў (пратаколаў) аб супрацоўніцтве, праграм супрацоўніцтва.

Па сваёй арганізацыі Дні ці Тыдні культуры пэўнай краіны ўключаюць толькі некалькі культурных мерапрыемстваў. У асноўным гэта канцэрты майстроў мастацтваў, асобныя выступленні фальклорных ці музычных калектываў, тэатраў, фотаэкспазіцыя, выстава твораў мастацтва. Мерапрыемствы ў асноўным праходзяць у сталіцы. Часам акрамя яе яшчэ ў некалькіх гарадах. “Культурны дэсант” налічвае ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх сотняў удзельнікаў. Напрыклад, для ўдзелу ў правядзенні мерапрыемстваў ў рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь ў Туркменістане ў 2015 г. прыбыло 60 чалавек [6]. А вось у геаграфічна больш бліжэйшую Эстонію на правядзенне Дзён культуры прыехала дэлегацыя з амаль 300 чалавек [7]. Зразумела, што ў апошнім выпадку і праграма мерапрыемстваў была больш цікавая. Наша нацыянальнае мастацтва былопрадстаўлена лепшымі ўзорамі оперы, балета, музыкі, фальклору.

Зразумела, што ахоп аўдыторыі ў такіх мерапрыемтсваў невялікі. Ды і публіку не заўсёды можна сабраць. Звычайна гэта прадстаўнікі дыяспары і дыпламатычнага корпуса, дзеячы і аматары мастацтва.

Спецыяльна для дэманстрацыі за мяжою пад час правядзення Дзён культуры была створана экспазіцыя графікі сучасных беларускіх мастакоў. Былі прадстаўлены творы лепшых айчынных графікаў розных пакаленняў, пачынаючы ад знаных мэтраў – Арлена Кашкурэвіча, Васіля Шаранговіча – і заканчваючы маладымі таленавітымі творцамі. У работах былі адлюстраваны самыя разнастайныя тэхнікі, прадстаўлена даволі шырокая тэматыка, а таксама сучасныя графічныя эксперыменты. У 2007 г. яна пабывала ў Таджыкістане, у 2008 г. – у Сірыі, Егіпце і Кітаі, у 2010 г. – у Венгрыі і Казахстане.

У 2002 г. у праграме Дзён культуры Рэспублікі Беларусь ў Санкт-Пецярбургу былі паказаны спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы “Чорная панна Нясвіжа” і “Ідылія”. У верасні 2010 г. у рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь у Літве на сцэне Літоўскага нацыянальнага тэатра драмы быў прадстаўлены спектакль “Пінская шляхта” Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага “Пане Каханку” быў паказаны ў Дні культуры Беларусі ў Літве ў 2011 г.



Репозиторий ВГУ

Аднак не заўсёды можна гаварыць аб тым, што ў рамках Дзян культуры Рэспублік Беларусь замежны глядач знаёміўся менавіта з беларускай культурай. Балет "Лебядзінае возера" Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Рэспублікі Беларусь быў паказаны ў рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь ў Балгарыі ў чэрвені 2002 г. У 2007 г. у рамках Дзён культуры Беларусі ў Егіпце Нацыянальны акадэмічны вялікі тэатр балета Рэспублікі Беларусь выступіў са спектаклем "Шкаўкунок" у Каіры і Александрыі. У ліпені 2008 г. на гала-канцэрце афіцыйнага адкрыцця Дзён культуры Рэспублікі Беларусь у Кітаі і на канцэрце ў г. Хуайджоу выступілі артысты Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча. Кітайскі глядач сярод іншага пачуў песні, якія нельга назваць беларускімі народнымі, – "Рабінушка", "Кацюша", "Калінка", "Падмаскоўныя вечары", а таксама ўбачыў танец "Мяцеліца" [8, с. 444]. У 2013 г. адной з цэнтральных падзей Дзён культуры Беларусі ў Эстоніі сталі выступленні Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь у Эстонскай нацыянальнай оперы. Былі паказаны балеты "Спартак" і "Шахразада", оперы "Князь Ігар" і "Мадам Батэрфляй" [7].

Добрай традыцыяй стала дэманстрацыя беларускіх фільмаў пад час афіцыйных Дзён культуры. Так беларускія фільмы ўвашлі ў праграму правядзення Дзён культуры Рэспублікі Беларусь ва Ўкраіне (1993, 2002), у Балгарыі (2002), Санкт-Пецярбургу (2002), Іране (2003), Сербіі (2005), Таджыкістане (2007), Кыргызстане (2008), Арменіі (2011), Казахстане (2012), Кітаі (2012), Туркменістане (2015) і інш.

Дні кіно Беларусі праводзіліся і як асобная афіцыйная акцыя. Так ў 1998 і 1999 г. яны адбыліся ва Ўкраіне. У 2003 і 2005 гг. – Дні беларускага кіно ў Літве і Малдове, а ў 2004 г. – у Польшчы і Славакіі, у 2005 г. – у Арменіі, Літве, Малдове, Германіі. У 2006 г. – у Малдове і Польшчы.

Здаралася, што арганізатарамі масштабных акцый, кшталту Дзён культуры выступалі грамадскія арганізацыі ці прыватныя асобы. Так у кастрычніку 1992 г. у Мінску, Магілёве і Полацку прайшлі Дні культуры Балгарыі. Арганізатарам была балгарскія Федэрацыя дружбы і Фонд "Славяне". У праграме былі выступленні хору "Гармонія" і маладзёжнага танцавальнага калектыву, выставы [8].

Дасягненнем лічыцца правядзенне ў красавіку 2002 г. Тыдня культуры Беларусі ў Францыі. Гэта падзея адбылася па ініцыятыве Пасольства Беларусі ў Францыі і дзякуючы падтрымцы вядомага французскага куцюр'е П. Кардэна.

З заснаваннем у кастрычніку 2001 г. у г. Кальяры (Італія) Асацыяцыі дружбы, культуры і супрацоўніцтва «Сардзінія-Беларусь» у гэтай аўтаномнай вобласці сталі штогод праводзіцца Дні беларускай культуры. А ў 2017 г. прайшоў Год беларускай культуры на Сардыніі.

Репозиторий ВГУ

Такім чынам Дні культуры застаюцца адным з асноўных складнікаў двухбаковых культурных стасункаў. А геаграфія, праграма і рэгулярнасць іх правядзення сведчаць аб ўзроўні палітычных сувязей.

1. Нацыянальны архіў Беларусі. – Ф. 974. Воп. 1. Спр. 2071. – Арк. 7.
2. Сотрудничество в области культуры, межрегиональных связей и других областях [Электронный ресурс]/ / Официальный сайт Посольства Республики Беларусь в Республике Сербия. – Режим доступа: http://serbia.mfa.gov.by/ru/bilateral_relations/cultural/e5cb094310602c58.html. – Дата доступа: 26.02.2019.
3. Кажура, М. В. Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва / М. В. Кажура // Беларуская культура сёння, 2008: гадавы агляд / М. А. Буданаў [і інш.] ; пад рэд. У. Ф. Матвейчука. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – С. 127–138.
4. Молакава, Вераніка. "Час змяніўся, але не адносіны" / Вераніка Молакава // Культура. – 2017. – № 23 (1306). – 10-16 черв. – С. 2.
5. Саўчанка, Аліна. Дні культуры Эстоніі / Аліна Саўчанка // Культура. – 2016. – 5–11 ліст. – С. 2.
6. Дни культуры Беларуси пройдут в Туркменистане [Электронный ресурс] // Официальный сайт Посольства Республики Беларусь в Туркменистане. – Режим доступа: http://turkmenistan.mfa.gov.by/ru/embassy/news/cd79c885377cb2d7.html. – Дата доступа: 13.03.2019.
7. "Купалінка" – у Таліне, "Эстонія" – у Мінску // Культура. – 2013. – № 6. – 9-16 лют. – С. 2.
8. Крывашэй, Д. А. Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі / Д. А. Крывашэй. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 521 с.
9. Бліжэй стала Балгарыя // Культура. – 1992. – № 38. – 5 кастрычніка. – С. 2.

## МОЛОДЕЖНЫЙ ВЕКТОР СТРОИТЕЛЬСТВА СОЮЗНОГО ГОСУДАРСТВА БЕЛАРУСИ И РОССИИ

М. А. Слемнёв (Витебск)

В декабре текущего года исполняется 20 лет со дня подписания стратегического Договора о создании белорусско-российского Союзного государства. За эти непростые годы сделано немало для сопряжения действий сотрудничающих сторон в аграрной, промышленной, социально-экономической, торговой, инновационно-технологической, оборонной и ряде других областей Союзного строительства. Достаточно эффективно функционирует система регионального, в том числе и приграничного взаимодействия. Вместе с тем здесь имеется множество нерешенных проблем и нереализованных возможностей. Об этом шел конструктивный разговор на состоявшемся 10–12 октября 2018 г. в Могилеве V Форуме регионов Беларуси и России. На нем принято решение следующий Форум (он пройдет осенью этого года в Санкт-Петербурге) посвятить молодежной тематике.

Предварительно очерчен и круг социальных реалий, которые должны стать центральным объектом внимания на пленарном и секционных за-



Репозиторий ВГУ